УДК 94(476)«1941»

# ЭВАКУАЦЫЯ 1941 ГОДА І МУЗЕІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

**Сугака Л. А.**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)

Анатацыя. У артыкуле разглядаецца праблема выратавання музейных каштоўнасцей БССР, над якімі ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны навісла пагроза захопу германскімі акупантамі. Шэраг трагічных абставінаў, суб'ектыўнага і аб'ектыўнага паходжання, прывёў да таго, што музейныя фонды Беларусі панеслі незаменныя страты.

Ключавыя словы: эвакуацыя, музейныя каштоўнасці, незаменныя страты, рээвакуацыя, рэстытуцыя.

Summary. This article discusses the problem of saving the museum values of the BSSR. Above them at the beginning of Great Patriotic War there was a threat of capture by the German occupiers. A number of tragic circumstances of subjective and objective origin, led to the fact that the museum funds of Belarus suffered irreparable losses.

Keywords: evacuation, museum values, irreparable losses, reevacuation, restitution.

Трагічнае для Чырвонай Арміі разгортванне ваенных падзей у пачатку Вялікай Айчыннай вайны патрабавала ажыццяўлення шырокамаштабных эвакуацыйных мерапрыемстваў. Адпаведна пастанове ЦК УКП(б) і СНК СССР ад 27 чэрвеня 1941 г., першачарговаму перамяшчэнню ў тылавыя рэгіёны краіны падлягалі «важнейшие промышленные ценности (оборудование – важнейшие станки и машины), ценные сырьевые ресурсы и продовольствие (цветные металлы, горючее, хлеб)», а таксама «квалифицированные рабочие, инженеры и служащие вместе с эвакуируемыми с фронта предприятиями, население, в первую очередь молодёжь, годная для военной службы, ответственные советские и партийные работники» [7, с. 208]. У вядомай дырэктыве ЦК УКП(б) і СНК СССР ад 29 чэрвеня 1941 г. гэты пералік дапоўнілі рухомы чыгуначны састаў і жывёла [8, с. 220]. Такім чынам, культурныя, у тым ліку і музейныя каштоўнасці, у спіс эвакуацыйных прыярытэтаў не трапілі. З аднаго боку, як нам уяўляецца, гэта можна растлумачыць дзеяннем аб'ектыўных абставін – экстрэмальныя ўмовы пачатку вайны патрабавалі ад уладаў Савецкага Саюза неадкладнага вырашэння шматлікіх і складаных пытанняў, сярод якіх праблема выратавання музейных калекцый аказалася на перыферыі ўвагі. Але, з другога боку, наўрад ці мы зробім памылку, калі звернем увагу на ідэалагізаванае мысленне і, за рэдкім выключэннем, абмежава-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ную адукаванасць вышэйшых савецкіх кіраўнікоў, што перашкаджала фарміраванню ў іх шырокіх поглядаў на культурную спадчыну чалавецтва.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны найбольш статуснымі музеямі Беларускай ССР з'яўляліся тыя, што знаходзіліся ў падпарадкаванні Наркамата асветы. Іх налічвалася 26. Акрамя таго, працавала значная колькасць ведамасных і грамадскіх музеяў (апошнія дзейнічалі пераважна ў школах) [4, с. 157–161; 5, с. 4, 7]. Па звестках прафесара А.А. Гужалоўскага, які даследаваў гісторыю музейнай справы ў Беларусі ў XIX–XX стст., у перадваенныя гады «Наркамасветы БССР не меў планаў выратавання музейных каштоўнасцяў у выпадку пагрозы іх знішчэння. У музеях не было ні планаў пагрузкі, ні спісаў прадметаў, якія падлягалі першачарговай эвакуацыі, ні ўпаковачных матэрыялаў» [5, с. 7]. Таму не дзіўна, што з заходніх і цэнтральных рэгіёнаў Беларусі, якія былі акупіраваны нямецкімі войскамі ўжо на працягу першага тыдня вайны, не ўдалося эвакуіраваць музейныя фонды. Толькі з Лідскага краязнаўчага музея на ўсход былі вывезены калекцыі. Аднак пад Смаленскам яны трапілі пад бамбёжку варожай авіяцыі і былі знішчаны. Загінуў і дырэктар музея П.М. Свірыдаў [5, с. 8].

Ва ўсходніх абласцях БССР меўся пэўны час для ажыццяўлення эвакуацыйных мерапрыемстваў. Але ж і тут, па вышэйзгаданых прычынах, узніклі цяжкасці з вывазам музейных збораў. Так, супрацоўнікі Віцебскага абласнога музея пад кіраўніцтвам дырэктара В.К. Зэйлерта здолелі выратавацць толькі частку калекцый. Экспанаты былі пагружаны ў вагон разам з фондамі Мастацкай галерэі Ю.М. Пэна і адпраўлены спачатку ў Куйбышаў, потым у Саратаў. Аднак у Віцебску засталося каля 15 тыс. прадметаў абласнога музея (да паловы яго фондавых збораў), абсалютная большасць з якіх бясследна знікла, у тым ліку і высокакаштоўныя калекцыі фарфора і нумізматыкі [5, с. 8].

Да вайны Магілёўскі гістарычны музей меў адну з багацейшых у рэспубліцы калекцый. Яго дырэктар І.С. Мігулін, ужо на другі пасля нападу Германіі дзень, звярнуўся да абласнога ваенкама І.П. Ваяводзіна з просьбай аб прадастаўленні аўтатранспарту для эвакуацыі музейных фондаў. Аднак той, па словах Мігуліна, назваў яго «панікёрам» і пагражаў арыштам [9, с. 17–18]. Праз некалькі дзён будынак музея па вул. Ленінскай разам з экспазіцыяй і фондамі быў знішчаны пажарам. Зніклі і найбольш каштоўныя экспанаты, якія захоўваліся асобна, у браніраваным пакоі-сейфе Магілёўскага абкама КП(б)Б. Сярод іх Крыж Еўфрасінні Полацкай, срэбная мітра рэлігійнага дзеяча і асветніка Георгія Каніскага, залаты і сярэбраны ключы г. Магілёва, інкруставанае каштоўнымі камянямі Евангелле, нумізматычная калекцыя і інш. [12, с. 70].

Пытанне аб лёсе Крыжа і іншых экспанатаў гэтай калекцыі заўжды выклікае значны грамадскі рэзананс. Існуе некалькі версій наконт таго, што з імі адбылося. На сёння асноўнай з іх з'яўляецца тая, адпаведна якой каштоўнасці ўсё-ткі былі эвакуіраваны з Магілёва ў савецкі тыл. Сапраўды, цяжка ўявіць, што кіраўніцтва абкама, якое ўжо 26 чэрвеня 1941 г. у спецыяльным цягніку адправіла на ўсход сваю дакументацыю і архівы (разам з дакументамі і архівамі шэрагу іншых партыйных арганізацый БССР), раптам «забылася» пра калекцыю вялікай матэрыяльнай і гісторыка-культурнай каштоўнасці, што знаходзілася ў яго ж будынку. Тым больш што захоўвалася яна там у самым важным месцы – браніраваным пакоі-сейфе. Таму верагоднасць эвакуацыі ў савецкі тыл Крыжа і іншых прадметаў з пакоя-сейфа лічым вельмі высокай.

Невядомы далейшы лёс калекцыі. Магчыма, яе экспанаты аселі ў запасніках сталічных ці правінцыйных музеяў Расіі. Але ні адзін з расійскіх музеяў пакуль не абвяшчаў аб наяўнасці ў яго прадметаў з магілёўскага збору. Магчыма, каштоўныя рэчы былі выкарыстаны ў якасці платы Злучаным Штатам за пастаўкі па ленд-лізу. Нельга выключыць магчымасць разрабавання экспанатаў на маршруце эвакуацыі (такія выпадкі з грузамі адбываліся) ці іх гібелі пад бамбёжкай (як гэта здарылася са зборамі Лідскага краязнаўчага музея) [9, с. 20; 12, с. 70–72]. Такім чынам, пытанне аб лёсе калекцыі Магілёўскага гістарычнага музея застаецца адкрытым. Сёння пошукам яе каштоўных прадметаў займаюцца розныя арганізацыі, у тым ліку Інтэрпол, які, ў прыватнасці, зарэгістраваў Крыж Еўфрасінні Полацкай пад нумарам 34-1130 [2, с. 25].

На нашу думку, лепшай ілюстрацыяй тэзіса аб тым, што ў партыйна-савецкіх структур адсутнічала неабходная ўвага да праблемы выратавання культурных каштоўнасцяў, з'яўляецца лёс большасці збораў гомельскіх музеяў. Менавіта музеяў, бо звесткі аб эвакуацыі з Гомеля калекцый толькі аднаго музея – гістарычнага – недакладныя. Адпаведна знойдзеным намі дакументам, разам з імі былі вывезены некаторыя экспанаты Гомельскага антырэлігійнага музея, які на той момант ужо быў юрыдычна самастойнай установай [6, л. 16; 11, л. 29]. Нягледзячы на пэўны запас часу (Гомель быў захоплены немцамі 19 жніўня 1941 г. – амаль праз 2 месяцы пасля пачатку вайны), асноўная частка калекцый гомельскіх музеяў не была эвакуіравана. Акупантам дасталіся каштоўнасці Гомельскага гістарычнага музея на суму 28 948 800 руб., Гомельскага антырэлігійнага музея на суму 700 000 руб. [12, с. 72–73]. У большасці сваёй яны былі вывезены ў Германію [1, с. 61]. У савецкі тыл (г. Сталінград) былі эвакуіраваны 4 299 адзінак захоўвання Гомельскага гістарычнага музея (творы жывапісу і скульптуры, гістарычныя дакументы, ювелірныя вырабы, высокамастацкія ўзоры ткацтва, посуд, калекцыі нумізматыкі, узнагарод, зброі, гадзіннікаў і г.д.) на суму 115 468 руб. 70 кап. і 34 адзінкі захоўвання Гомельскага антырэлігійнага музея (творы жывапісу і скульптуры, царкоўныя рэчы, археалагічныя артэфакты г.д., сума ў дакуменце адсутнічае) [6, л. 8, 11-13; 11, л. 12-29]. Адпаведна рашэнню эвакуацыйнай камісіі Гомеля на шляху ў Сталінград каштоўнасці суправаджаліся дырэктарам гістарычнага музея С.Т. Антонавым. Пры транспарціроўцы частка экспанатаў была пашкоджана. Музейныя рэчы прыбылі на месца прызначэння 28 ліпеня 1941 г., да 8 жніўня перадаваліся Антонавым на захоўванне Сталінградскаму музею краязнаўства [12, с. 73]. Здзіўляе, што для суправаджэння музейных прадметаў у тыл быў камандзіраваны дырэктар музея, пры тым, што асноўная частка яго збораў засталася ў Гомелі і не была выратавана.

Такім чынам, дакументальна пацверджаны факт эвакуацыі летам 1941 г. музейных каштоўнасцяў з 5 дзяржаўных музеяў Беларускай ССР – Лідскага краязнаўчага, Віцебскага абласнога, віцебскай Мастацкай галерэі Ю.М. Пэна, гомельскіх гістарычнага і антырэлігійнага музеяў. Хутчэй за ўсё, былі таксама вывезены, як указвалася вышэй, каштоўныя рэчы Магілёўскага гістарычнага музея з пакоя-сейфа Магілёўскага абкама КП(б)Б.

У катастрафічных умовах апынулася большасць з тых музеяў, якія не былі эвакуіраваны і засталіся на акупіраванай ворагам тэрыторыі. Так, Дзяржаўная мастацкая галерэя БССР, кіраўніцтва якой у першыя дні вайны пакінула Мінск, страціла ў выніку 48 слуцкіх паясоў, 2 тыс. адзінак жывапісу, 1,5 тыс. адзінак графікі, 250 адзінак скульптуры і 2,5 тыс. адзінак твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія былі разрабаваны мясцовымі марадзёрамі, а потым і акупантамі [5, с. 10; 3, с. 25]. Маштабнаму разрабаванню падвергліся таксама калекцыі Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея, Баранавіцкага абласнога мастацкага музея, Беластоцкага абласнога мастацкага музея, Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, Пінскага абласнога гісторыка-краязнаўчага музея і інш. [5, с. 11–12]. Частка вывезеных немцамі музейных рэчаў (каля 15 тыс. адзінак) вярнулася ў Беларусь з Германіі дзякуючы намаганням савецкай ваенна-акупацыйнай адміністрацыі, сярод іх і некаторыя карціны з Дзяржаўнай мастацкай галерэі [5, с. 15].

Адзначым, аднак, што і тыя калекцыі, што былі эвакуіраваны ў савецкі тыл, таксама панеслі страты. Напрыклад, гомельскія зборы, якія спачатку аказаліся ў Сталінградзе, а потым, калі апошні сам стаў франтавым горадам, былі перавезены ў Камышын і Урупінск. У траўні-чэрвені 1946 г. гомельскія музейныя прадметы былі рээвакуіраваны ў свой горад, што абышлося гамяльчанам у суму 6 000 руб. Пры гэтым многія экспанаты мелі пашкоджанні і патрабавалі складанай рэстаўрацыі. Але 269 рэчаў (творы жывапісу і скульптуры, ювелірныя упрыгожанні, узнагароды, узоры высокамастацкага ткацтва, рарытэтная мэбля, посуд, фалерыстыка іінш.) так і не вярнуліся, па розных прычынах, з эвакуацыі [10, л. 1; 11, л. 50–52; 5, с. 25; 12, с. 91–92].

Такім чынам, у гады Вялікай Айчыннай вайны музеі Беларускай ССР панеслі незаменныя страты, бо савецкія эвакуацыйныя мерапрыемствы 1941 г. ахапілі толькі нязначную частку іх фондаў. Некаторыя з музейных экспанатаў не вярнуліся з эвакуацыі, таму пытанне іх рэстытуцыі не страціла актуальнасці і па сённяшні час.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Літаратура:**


1. Анісковіч, У. Палац над Сожам / У. Анісковіч // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 3. – С. 59–62.
2. Арлоў, У. Гісторыя Беларусі: год за годам / У. Арлоў // Беларуская мінуўшчына. – 1993. – № 2. – С. 20–25.
3. Воронкова, И.Ю. Двадцать второго июня, ровно в четыре часа… Минск и минчане в первые дни Великой Отечественной войны / И.Ю. Воронкова. – Минск : Беларуская навука, 2011. – 265 с.
4. Гужалоўскі, А.А. Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А.А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2002. – 176 с.
5. Гужалоўскі, А.А. Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / А.А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2004. – 218 с.
6. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. – Фонд р-1345/с-42. Воп. 2. Спр. 4.
7. Из истории Великой Отечественной войны. Начало войны (22–30 июня 1941 г.) / Известия ЦК КПСС. – 1990. – № 6. – С. 196–222.
8. Из истории Великой Отечественной войны. Директива СНК СССР и ЦК ВКП(б). 29 июня 1941 г. / Известия ЦК КПСС. – 1991. – № 6. – С. 217–220.
9. Кондратьева, Л.Ф. Из истории музейного дела в Могилёве 1867–1941 гг. / Л.Ф. Кондратьева // Гісторыя Беларускага Падняпроўя (да 130-годдзя Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея) : матэрыялы навук. канф., Магілёў, 13–14 лістапада 1997 г. / Магілёўскі абл. краязнаўчы музей ; рэдкал.: С.І. Бяспанскі [і інш.]. – Магілёў, 1999. – С. 3–20.
10. Музей «Гомельскі палаца-паркавы ансамбль» (МГППА). – Фонд 9. Воп. 1. Спр. 7.
11. МГППА. – Фонд 10. Воп. 1. Спр. 2.
12. Сугако, Л.А. Население, материальные ресурсы и культурные ценности Белорусской ССР в эвакуационном процессе в годы Великой Отечественной войны (1941–1944 гг.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Л.А. Сугако. – Могилёв, 2014. – 157 л.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова